**А. А. Босак**

*Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*e-mail: bosaka@tut.by*

# ВЫКАРЫСТАННЕ СІСТЭМЫ MOODLE Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ЗАМЕЖНЫМ МОВАМ

У артыкуле адлюстраваны кароткія звесткі аб выкарыстанні сістэмы Moodle пры навучанні замежным мовам студэнтаў. Дадзены ключавыя характарыстыкі сістэмы Moodle, апісаны яе асноўныя магчымасці, разглядаюцца інтэрактыўныя інструменты віртуальнай адукацыйнай платформы Moodle, выяўлены асноўныя ўмовы арганізацыі навучальнага працэсу.

*Ключавыя словы:* LMS Moodle; дыстанцыйнае навучанне; электроннае навучанне; замежная мова; элементы курса; рэсурсы курса.

**А. А. Босак**

*Белорусский государственный экономический университет*
*Минск, Республика Беларусь*
*e-mail: bosaka@tut.by*

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ СИСТЕМЫ MOODLE В ПРОЦЕССЕ ОБУЧЕНИЯ ИНОСТРАННЫМ ЯЗЫКАМ

В статье отражены краткие сведения об использовании системы Moodle в обучении студентов иностранным языкам. Даны ключевые характеристики системы Moodle, описаны ее основные возможности, рассмотрены интерактивные инструменты виртуальной образовательной платформы Moodle, определены основные условия организации учебного процесса.

*Ключевые слова:* LMS Moodle; дистанционное обучение; электронное обучение; иностранный язык; элементы курса; ресурсы курса.

**A. A. Bosak**

*Belarus State Economic University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*e-mail: bosaka@tut.by*

# USING THE MOODLE SYSTEM IN THE PROCESS OF TEACHING FOREIGN LANGUAGES

A brief account on the use of Moodle systems in teaching foreign languages to students is provided in the article. The key characteristics of the Moodle system are given, its main opportunities are described, the interactive tools of the Moodle virtual educational platform are considered, the main conditions for organizing the educational process are determined.

*Key words:* LMS Moodle; distance learning; e-learning; foreign language; course elements; course resources.

Цяпер Беларусь знаходзіцца ў працэсе актыўнага развіцця і ўкаранення электроннай формы навучання. Асноўнай прычынай узнікнення электроннай адукацыі служыць вялікі аб'ём інфармацыі: сучасны свет імкліва развіваецца, адбываюцца змены ў лакальным і глабальным маштабах.

Актыўнае развіццё сучасных камп’ютарных тэхналогій і глабальных інфармацыйных сетак усё больш стымулюе з’яўленне новых методык прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў. У прыватнасці, усё большую папулярнасць набывае выкарыстанне Інтэрнэт-тэхналогій у навучанні. У цяперашні час у ўніверсітэтах РБ навучальны працэс прадугледжвае новыя мадэлі дыстанцыйнага ўзаемадзеяння на базе сістэм кіравання навучаннем. Адной з найбольш папулярных сістэм такога тыпу з’яўляецца Moodle.

Moodle (англ. «Learning Management System» или LMS), – (модульнае аб’ектна-арыентаванае дынамічнае навучальнае асяроддзе) – гэта свабодная сістэма кіравання навучаннем, арыентаваная перш за ўсё на арганізацыю ўзаемадзеяння паміж выкладчыкамі і навучэнцамі, хоць падыходзіць і для арганізацыі традыцыйных дыстанцыйных курсаў, а таксама падтрымкі вочнага навучання.

Сістэма кіравання навучаннем Moodle эфектыўна выкарыстоўваецца ў шматлікіх краінах, у тым ліку і для навучання замежным мовам. Выкладанне замежнай мовы мае пэўныя спеціфічныя асаблівасці, якія абумоўліваюць выбар аптымальнай адукацыйнай платформы, якая адпавядае пастаўленым патрабаванням і чаканым вынікам. Сістэма навучання Moodle прапануе шырокі спектр магчымасцяў для паўнавартаснай падтрымкі працэсу навучання ў дыстанцыйным асяроддзі – разнастайныя спосабы прадстаўлення навучальнага матэрыялу, праверкі ведаў і кантролю паспяховасці. Магчымасці сістэмы Moodle дазваляюць арганізаваць эфектыўны працэс вывучэння замежнай мовы, які праводзіцца ў адзінай вэб-прасторы за кошт наяўнасці інструментаў, прыдатных для стварэння інтэрактыўнага мультымедыйнага адукацыйнага кантэнту, кіравання вучэбнай дзейнасцю студэнтаў, забеспячэння камунікацыі і ўкаранення разнастайных формаў педагагічнага ўзаемадзеяння. Выкладчык мае магчымасць ствараць электронныя курсы з улікам узроўню валодання замежнай мовай навучэнцаў, а таксама вар'іраваць змест навучальных модуляў, ствараць дынамічны мультымедыйны кантэнт і планаваць інтэрактыўныя формы работы, што спрыяе самастойнай вучэбнай і пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Сістэма Moodle падтрымлівае абмен файламі любых фарматаў як паміж выкладчыкам і студэнтам, так і паміж самімі студэнтамі. Гэта

сістэма дазваляе зручна прадстаўляць увесь навучальны курс дысцыпліны, пачынаючы з арганізацыйнага матэрыялу – вучэбнай праграмы, раскладу, гласарыя і г. д. – і заканчваючы забеспячэннем студэнтаў навучальнымі дапаможнікамі па вывучаемай дысцыпліне ў больш зручным электронным фармаце, у якіх выкарыстоўваюцца гіперспасылкі, прадугледжана дзяленне на раздзелы і блокі, прымяняюцца сродкі нагляднасці, відэа і аўдыё матэрыялы.

Спынімся на паняццях рэсурсы курса і элементы курса.

Рэсурсы курса – гэта яго змесціва, г. зн. тэарэтычныя матэрыялы, якія выкладчык размяшчае ў раздзелах курса. Яны могуць быць прадстаўлены ў выглядзе файлаў ці выглядзе спасылак на знешнія сайты. У якасці рэсурсаў курса можна выкарыстоўваць розныя фарматы дакументаў: тэставая старонка, вэб-старонка, спасылка на файл або вэбстаронку, спасылка на каталог, тлумачэнні, кніга. Рэсурсы курса можна дадаваць і фарматаваць [1].

Элементы курса – гэта той матэрыял, які патрабуе актыўнай працы студэнта. Менавіта праца з элементамі курса ацэньваецца выкладчыкам і дазваляе выставіць выніковую адзнаку за засваенне навучальнага курса. Да элементаў курса адносяць: заданне, форум, семінар, чат, тэст, занятак, апытанне, гласарый, анкета, анкетнае апытанне, рабочы сшытак, практыкаванні, вікі [1]. Так, напрыклад, опцыі сістэмы Moodle «Семінар», «Форум», «Вікі» дазваляюць планаваць формы работы, пабудаваныя на элементах дыскусіі і сумеснай працы студэнтаў. Па меры калектыўнага абмеркавання праблемных пытанняў выяўляюцца розныя супрацьлеглыя пункты гледжання, прапануюцца і аргументуюцца новыя ідэі, адбываецца натуральны працэс спазнання. Элементы «Анкета», «Форум», «Апытанне» дазваляюць адзначыць індывідуальныя патрэбнасці навучэнцаў і распрацаваць заданні з іх улікам. Студэнты адказваюць на пытанні, якія дазваляюць вызначыць узровень валодання мовай, выявіць сферу прафесійных інтарэсаў, а таксама адсачыць дынаміку. Элемент «Чат» спрыяе развіццю іншамоўных камунікатыўных навыкаў студэнтаў, а менавіта развіццю пісьмовай мовы на замежнай мове. Дадзены элемент дазваляе падтрымліваць пастаянную камунікацыю ўдзельнікаў курса, а таксама абменьвацца паведамленнямі асабіста з выкладчыкам або асобнымі карыстальнікамі.

Вельмі карысным элементам курса з'яўляецца журнал адзнак. У сістэме Moodle рэалізавана гібкая і даволі складаная сістэма адзнак за выкананыя заданні. Кожнаму студэнту даступны толькі яго адзнакі. На падставе гэтых адзнак, а таксама на падставе актыўнасці студэнта

выкладчык можа выбудоўваць рэйтынгавую сістэму для кожнага студэнта.

У сістэме Moodle прадстаўлены шырокі дыяпазон настроек тэстаў, якую кожны выкладчык выкарыстоўвае ў адпаведнасці са сваімі спецыфічнымі задачамі. Можа быць прапанавана выкананне тэстаў на час, з абмежаванай колькасцю спроб, з выпадковым наборам пытанняў і г. д. У сістэме могуць прысутнічаць пытанні некалькіх тыпаў: пытанне на выбар варыянту, пытанне, на якое трэба даць вольны адказ (эсэ), пытанне з укладзенымі адказамі і г. д. Кожны адказ выкладчык можа прагледзець, убачыць час, затрачаны на праходжанне дадзенага пытання, колькасць адказаў, г. зн. у колькіх спробах уводзіўся правільны адказ, працэнт адказаў (правільных і няправільных).

Яшчэ адным немалаважным элементам курса з’яўляецца гласарый, які дазваляе арганізаваць працу з тэрмінамі, якія з’яўляюцца ва ўсіх матэрыялах курсаў і з’яўляюцца гіперспасылкамі на адпаведныя артыкулы гласарыя. Выкладчык сам можа стварыць гласарый, які будзе даступны для студэнта, а таксама можа арганізаваць працу студэнтаў па запаўненні гласарыя. Гласарыі могуць быць глабальнымі, галоўнымі, другаснымі. Выкладчык можа сам дадаваць каментарыі да артыкулаў гласарыя і можа дазволіць гэта рабіць студэнтам. Таксама ў гласарый студэнты могуць запісваць незнаёмыя словы і словазлучэнні, што дазваляе ім абменьвацца ведамі, а выкладчыку скласці паняцце аб тым, што выклікае ў студэнтаў цяжкасці.

Такім чынам, тэхналогія стварэння навучальных сайтаў на платформе Moodle – вельмі актуальная і перспектыўная тэма для працы выкладчыкаў, бо выкарыстанне і развіццё ўласных курсаў навучання замежным мовам дазваляе не толькі шматкратна павысіць эфектыўнасць навучання, але і стымуляваць студэнтаў да далейшага самастойнага вывучэння замежнай мовы. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій дазваляе зрабіць працэс навучання такім захапляльным, як ніколі раней. Дынамічнае навучальнае асяроддзе Moodle, спецыяльна створанае распрацоўшчыкамі для дапамогі выкладчыку ў падрыхтоўцы яго ўласных аўтарскіх курсаў, можа стаць магутнай дапамогай для яго выкладчыцкай дзейнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гильтмундинов А. Х.* Электронное образование на платформе Moodle / А. Х. Гильтмундинов, Р. А. Ибрагимов, И. В. Цивильский. – Казань : КГУ, 2008. – 169 с.